ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«СЛУЦКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА»
АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ І ІНФАРМАЦЫІ

# ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ КАЛЕНДАРА, 2025
## г. Слуцк, Слуцкі раён

Слуцк, 2024

*“Гэты горад заўсёды ў топе самых наведвальных турыстамі. Яго назва шырока вядомая ў Беларусі і за яе межамі - хто не чуў пра Слуцкія паясы, Сафію Слуцкую і князёўну Анастасію Слуцкую? А мясцовыя сыры, цукар і хлеб даўно сталі візітнай карткай раёна”.*

*па матэрыялах газеты “Мінская праўда”*

Веліч і славу горада стваралі многія пакаленні случчан, людзі розных прызванняў і прафесій. Многія з іх з’яўляюцца юбілярамі 2025 года. Юбілейным будзе гэты год і для шэрага арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў Случчыны.

Спіс уключае пералік дат, якія адлюстроўваюць асноўныя падзеі і факты з жыцця краю, юбілейныя даты дзеячаў, месца нараджэння, жыццё ці дзейнасць якіх звязаны з краем. Даты жыцця асоб даюцца ў новым каляндарным стылі, пасля даты нараджэння ўказваецца месца нараджэння. Спіс прызначаны ў дапамогу арганізацыі краязнаўчай работы, бібліятэкарам, работнікам музеяў, а таксама ўсім, хто цікавіцца мінулым і сучасным Слуцкага краю.

Пачынаецца спіс з інфармацыі ў храналагічнай паслядоўнасці аб падзеях. Далей прадстаўлена інфармацыя аб персаналіях таксама ў храналагічнай паслядоўнасці.

Асновай для стварэння спіса “Памятныя даты календара 2025, г. Слуцк, Слуцкі раен” з’яўляюцца звесткі з наступных выданняў:

**Архітэктура Беларусі** : энцыкл. даведнік / рэдкал. : А. А.Воінаў [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993. – 620 с.

**Асветнікі зямлі Беларускай**, X – пачатак XX ст. : энцыкл. даведнік / [рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. – 492 с. : фат., іл.

**Беларуская мова** : энцыклапедыя / Беларуская Энцыклапедыя ; пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1994. – 654 с. : фат., іл.

**Беларуская энцыклапедыя** : у 18 т. / Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1996–2004. – 18 т.

**Беларускі фальклор** : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005–2006. – 2 т.

**Беларускія пісьменнікі** : біябібліягр. слоўнік : у 6 т. / Ін-т імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларуская энцыклапедыя; рэдкал. : А. В. Мальдзіс [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1992–1995. – 6 т.

**Беларусь** : энцыкл. даведнік / Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал. : Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. М. В. Драко, А. М. Хількевіч. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1995. – 799 с. : фат., іл.

**Видлога, В. С. Слуцк : по старым адресам** / В. С. Видлога ; Государственное учреждение "Слуцкий краеведческий музей". – Минск : Беларуская навука, 2019. – 196, [2] с.

**Волкаў, М. А. Замкі і фартэцыі Радзівілаў на беларускіх землях у XVI — пачатку XVIII ст.** / Мікола Волкаў ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі,

Інстытут гісторыі. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2021. – 214, [1] с.

**Волкаў, М. А. Слуцк на старых планах** / Мікалай Волкаў ; навук. рэд. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : Беларусь, 2017. – 159 с.

**Вялікае княства Літоўскае :** энцыклапедыя : у 2 т. /рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2006. – 2 т.

**Марціновіч, А. Случчына. Старонка міла і багата** / Алесь Марціновіч. - Мінск : Беларусь, 2019. – 159 с. – (Падарожжа па родным краі).

**Минская область** : энциклопедия : в 2 т. / редкол. : Л. Ф. Крупец, Г. П. Пашков [и др.]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2007. - 2 т.

**Памяць :** гіст.-дакум. хроніка Слуцкага р-на і г.Слуцка : у 3 кн. – Мінск : БЕЛТА, 2000–2015. – 3 т.

**Регионы Беларуси** : энциклопедия : в 7 т. / редкол. : В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. - Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016–2017. – 7 т.

**Республика Беларусь** : энциклопедия: в 6 т. / редкол. : Г. П. Пашков (гл.ред.) [и др.] – Минск : Беларуская энцыклапедыя, 2005–2008. – 6 т.

**Рэлігія і царква на Беларусі** : энцыкл. даведнік / [рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. А. А. Глекаў]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2001. – 366 с. : фат., іл.

**Случтина. История и современность** / Слуцкий районный исполнительный комитет. – Минск : БЕЛТА, 2011. – 96 с.

**Случчына: ілюстраваны летапіс краю** / гал. рэд. Г. М. Галаватая ; рэд. А. В. Жыбуль. – Мінск : БЕЛТА, 2016. – 200 с.

**Случчына. Памнажаем створанае** = Слутчина. Умножаем созданное = Slutsk region. Increasing the previous achievements / [аўтар тэксту З. Д. Шклянік ; рэдкалегія: У. Л. Гога і інш. ; фота: В. В. Ражкоў]. – Мінск : Колорград, 2022. – 97, [2] с.

**Спортивная энциклопедия Беларуси** / редкол. : Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя, 2005. – 503 с. : фот.

**Ціткоўскі, І. А. Мастацтва Случчыны : гісторыя, імёны, творы** / Ігар Ціткоўскі. – Мінск : Тэхналогія, 2019. – 211 с.

**Ціткоўскі, І. А. Слуцк. Гісторыя горада ў помніках архітэктуры** / Ігар Ціткоўскі. – Мінск : Смэлтак, 2015. – 318 с.

**Энцыклапедыя гісторыі Беларусі** : у 6 т. / Беларуская Энцыклапедыя ; рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 1993–2003. – 6 т.

**Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі** : у 5 т. / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1984–1987. – 5 т.

**Этнаграфія Беларусі** : энцыклапедыя / Беларуская Савецкая Энцыклапедыя ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1989. – 575 с. : фат., іл.

# Слуцк: падзеі і час



**1020** гадоў з часу першага ўпамінання Слуцка ў статутнай грамаце 1005 года аб утварэнні Тураўскай епархіі (1005 г.)

**865** гадоў таму Слуцк стаў цэнтрам удзельнага княства (1160 г.)

**820** гадоў з часу з'яўлення першых гістарычных звестак пра слуцкі Свята-Троіцкі (Трайчанскі) манастыр (1205 г.)

**615** гадоў з дня удзелу Слуцкага апалчэння ў Грунвальдскай бітве супраць крыжакоў, дзе аб'яднаныя войскі Польскага каралеўства і ВКЛ разграмілі Тэўтонскі ордэн (15.07.1410 г.)

**545** гадоў з часу першага ўпамінання ў гістарычных дакументах в. Грэск (1480 г. )

**520** гадоў назад адбылося самае спусташальнае нападзенне крымскіх татар на Беларусь. Зноў быў захоплены і разрушаны драўляны Слуцк ( жнівень 1505 г.)

**430** гадоў назад горад Слуцк захоплены паўстанцкім атрадам Севярына Налівайкі (лістапад 1595 г.)

**425** гадоў з часу заснавання Спаса-Праабражэнскага праваслаўнага мужчынскага манастыра (1600 г.)

**360** гадоў з дня заснавання па ініцыятыве губернатара Слуцкага княства К. Клакоцкага друкарні ў Слуцку (1665 г.)

**285** гадоў з пачатку дзейнасці Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў (1740-1844 г.)

**270** гадоў назад з дазволу князя Геранiма Фларыяна Радзівіла і благаслаўлення Кіеўскага мітрапаліта адбыўся перанос мошчаў святога Гаўрыіла з Заблудава ў Слуцк (май 1755 г.)

**240** гадоў з часу заснавання Слуцкага духоўнага вучылішча (15.09.1785 г.)

**205** гадоў назад у Слуцку адкрыўся прыватны жаночы пансіён (1820 г.)

**140** гадоў з часу заснавання ў в. Прошчыцы школы для сялянскіх дзяцей.(1885 г.)

**120** гадоў назад заснавана слуцкая арганізацыя РСДРП (вясна 1905 г.)

**115** гадоў назад адкрылася прыватнае камерцыйнае вучылішча (1910 г.)

**110** гадоў назад закончана будаўніцтва чыгуначнай лініі Асіповічы-Слуцк (1915 г.)

**105** гадоў назад 14 слуцкіх партызан (салдаты А. Камінскі, П. Ярмаліцкі, М. Емельянчык, партызаны Н. Бянько, М. Цішкевіч, П. Сцепановіч, М. Цішкевіч, М. Цішкевіч, П. Саладуха, М. Раўтовіч, С. Красуцкі, Я. Грачук, Я. Сімановіч, М. Бычанка) былі казнены на гарадскіх могілках пасля прыгавору ваенна-палявога суда. (25.04.1920 г.)

**105** гадоў назад польскія войскі пакінулі Слуцк. (24.11. 1920 г.)

**100** гадоў назад пачаў працаваць гарбарны завод з шавецкай майстэрняй (студзень 1925 г.)

**100** гадоў назад пачала дзейнічаць Слуцкая акруговая філія Усебеларускага літаратурнага аб’яднання “Маладняк” (1925 г.)

**95** гадоў назад выйшаў з друку зборнік краязнаўчых артыкулаў “Случчына” (1930 г.)

**95** гадоў з часу заснавання рамонтнай майстэрні, атрымаўшай ў 1945 годзе статус аўтарамонтнага завода (1930 г.) (цяпер - ААТ “Слуцкі завод пад'ёмна-транспартнага абсталявання")

**95** гадоў з часу заснавання калгаса імя Арджанікідзэ (цяпер – ААТ “Вясейскі Пакроў” (1930 г.)

**95** гадоў з часу заснавання калгаса імя Энгельса (цяпер – ААТ “Падлессе-2003” (1930 г.)

**95** гадоў з часу заснавання Слуцкага кансервавага завода (1930 г.)

**95** гадоў з часу заснавання Слуцкай мэблевай фабрыкі, як арцелі, выпускаючай некалькі дзесяткаў шафаў і сталоў (1930 г.)

**90** гадоў з часу заснавання Слуцкага масласырзавода (май 1935 г.) (цяпер – ААТ “Слуцкі сыраробчы камбінат”).

**90** гадоў з часу заснаванння вучэбна-вытворчага прадпрыемства Беларускага таварыства сляпых (1935 г.) (цяпер – вытворчае унітарнае прадпрыемства "Ямпаль-Слуцк" грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства інвалідаў па зроку")

**80** гадоў назад пачала функцыянаваць станцыя хуткай медыцынскай дапамогі пры Слуцкім гарадскім аддзеле аховы здароўя (жнівень 1945 г.) (14 ліпеня 1945 года зацверджаны штатны расклад станцыі). Цяпер - Слуцкая падстанцыя хуткай медыцынскай дапамогі дзяржаўнай установы аховы здароўя “Мінскі абласны цэнтр хуткай медыцынскай дапамогі”

**75** гадоў з часу заснавання Слуцкага гарадскога Дома піянераў і школьнікаў (цяпер – ДУА “Слуцкі цэнтр дзіцячай творчасці”) (1950 г.)

**75** гадоў з часу заснавання Слуцкага народнага тэатра драмы і камедыі імя У.Галубка (1950 г.)

**75** гадоў назад адкрылася дзіцячая музычная школа (1950 г.) (цяпер – ДУА “Слуцкая дзіцячая школа мастацтваў”)

**75** гадоў назад ўзведзены будынак чыгуначнага вакзала (1950 г.)

**70** гадоў назад створаны духавы аркестр Слуцкага гарадскога дома культуры (1955 г.) (у 1975 г. аркестру прысвоена званне “народны”)

**65** гадоў назад на базе арцелі “1 Мая” створана фабрыка мастацкіх вырабаў (1960 г.) (цяпер – РУП “Слуцкія паясы”).

**65** гадоў назад Слуцкі раён стаў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве (1960 г.)

**65** гадоў назад створаны Слуцкі мантажна-эксплуатацыйны ўчастак звадкаванага газу (цяпер – міжраённае вытворчае упраўленне “Слуцкміжрайгаз”) (1960 г.)

**65** гадоў назад пачала дзейнічаць міжкалгасная птушкафабрыка (з 1975 года – племптушказавод) (1960 г.) (цяпер – філіял “Генетык” ААТ “Смалявічы Бройлер”)

**60** гадоў назад даў першую прадукцыю Слуцкі цукровафінадны камбінат (25.12. 1965 г.)

**60** гадоў назад адкрыўся кінатэатар “Цэнтральны” (1965 г.)

**50** гадоў назад створана гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма (1975 г.)

**50** гадоў назад створана аўтатранспартнае прадпрыемства “Слуцкагратранс” (1975 г.)

**45** гадоў з дня адкрыцця ДУА "Яслі–сад №19 г.Слуцка" (1980 г.)

**40** гадоў назад першых вучняў прыняла СШ №11 г. Слуцка (01.09.1985 г.) (цяпер – Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа № 11 г. Слуцка")

**40** гадоў назад у выдавецтве "Полымя" выйшла з друку кніга А.П.Грыцкевіча "Древний город на Случи"(1985 г.)

**40** гадоў назад ў в. Казловічы пачала дзейнічаць дзіцячая школа мастацтваў (1985 г.) (цяпер – ДУА "Казловіцкая дзіцячая школа мастацтваў")

**40** гадоў назад быў пабудаваны спартыўна-аздараўленчы комплекс "Дэльфін" (1985 г.)

**35** гадоў з часу адкрыцця ДУА "Яслі-сад № 4 г. Слуцка" (красавік 1990 г.)

**35**гадоў назад на тэрыторыі Міхайлаўскай царквы ўзведзена капліца – іконная лаўка (1990 г.)

**35** гадоў назад створаны ўзорны хор "Пралескі" Слуцкай дзіцячай школы мастацтваў (1990 г.)

**30** гадоў з часу выхада першага нумара газеты "Дзіва" (чэрвень 1995 г.)

**30** гадоў назад пачала дзейнічаць капліца Свята-Міхайлаўскага сабора на вуліцы М. Багдановіча (снежань, 1995 г.)

**25** гадоў з дня адкрыцця у Слуцку помніка святой Сафіі Слуцкай (24.09.2000 г.)

**25** гадоў назад выйшаў з друку першы том кнігі "Памяць: гіст.-дакум. хроніка Слуцкага р-на і г. Слуцка" (укладальнік В. Відлога) (кастрычнік 2000 г.)

**20** гадоў назад Слуцкай гарадской цэнтральнай бібліятэцы ўручаны Дыплом аб прысваенні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі "Бібліятэчная справа" (7.01.2005 г.)

**20** гадоў назад у весцы Сярагі пачала дзейнічаць новая Свята-Пакроўская царква (5.02.2005 г.)

**20** гадоў з часу аб'яднання Слуцкага раёна і горада Слуцка ў адну адміністратыўна-тэрытарыяльную адзінку – Слуцкі раён з адміністратыўным цэнтрам г. Слуцк. (28.03.2005 г.) (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №156 ад 28 марта 2005 г.)

**20** гадоў назад на тэрыторыі 307-й асобнай чыгуначнай брыгады адкрыты помнік Герою Савецкага Саюза П. І. Купрыянаву (6.05.2005 г.)

**20** гадоў з часу адкрыцця філіяла «Галерэя мастацтваў ім. У. С. Садзіна» дзяржаўнай установы «Слуцкі краязнаўчы музей» (8.10.2005 г.)

**20** гадоў назад у Слуцку праходзіў рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў сельскай гаспадаркі "Дажынкі–2005" (7-8.10.2005 г.)

**15** гадоў з часу адкрыцця Мінскага абласнога кадэцкага вучылішча (01.09.2010 г.)

**15** гадоў назад у в. Сорагі адкрыўся храм у імя святога прарока і прадцечы Іаана Хрысціцеля (снежань 2010 г.)

**15** гадоў назад у раённай цэнтральнай бальніцы адкрыта аддзяленне гемадыялізу (29.12.2010 г.)

**10** гадоў назад калектыў Музея гісторыі слуцкіх паясоў стаў лаўрэатам прэміі "За духоўнае адраджэнне" (студзень 2015 г.)

**10** гадоў назад рашэннем Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, ступня Соф'і Слуцкай, якая захоўвалася ў Свята-Духавым саборы ў Мінску, назаўжды перанесена ў Слуцк на вечнае захоўванне ў жаночым Сафійскім манастыры (красавік 2015 г.)

**10** гадоў назад выйшла ў свет 3-я кніга гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць. Слуцкі раён. Слуцк" (укладальнік В. Відлога) (май 2015 г.)

# Асобы ў гісторыі краю



**605** гадоў з дня нараджэння **Сямёна Аляксандравіча Алелькавіча** (1420, Слуцк – 1470), слуцкага князя, апошняга князя Кіеўскага.

**400** гадоў з дня нараджэння **Клакоцкага Казіміра Крыштофа** (каля 1625 – 24.10.1684), дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, заснавальніка друкарні ў Слуцку (1665 г.)

**375** гадоў з дня нараджэння **Вашчанкі Максіма Ярмалініча** (1650-я гг., Магілеў – 1708), друкара і гравёра па медзі. Друкарскую дзейнасць пачаў у Слуцку.

**135** гадоў з дня нараджэння **Гаўрыса Івана Трафімавіча** (1890, Слуцкі р-н – 1937), жывапісца, графіка, педагога, аўтара успамінаў аб Віцебскай мастацкай школе.

**120** гадоў з дня нараджэння **Мартыненка Кацярыны Віктараўны** (1905, г. Слуцк – ?), актрысы.

# Студзень

**95** гадоў з дня нараджэння **Шырына Леаніда Іванавіча** (1.01.1930, в. Працавічы - 1996), пісьменніка.

**85** гадоў з дня нараджэння **Забелы Яўгена Пятровіча** (12.01.1940, в. Мерашына – 2023), вучонага ў галіне электраэнергетыкі, доктара тэхнічных навук.

**70** гадоў з дня нараджэння **Трафімавай Таісіі Іванаўны** (21.01.1955, былы пасёлак Манькова, Слуцкі раён), беларускага педагога, журналіста, актрысы, паэтэсы.

# Люты

**75** гадоў з дня нараджэння **Санько Аляксандра Фёдаравіча** (2.02.1950, в. Маяк – 27.07.2021), вучонага-геолага, доктара геолага-мінералагічных навук.

**70** гадоў з дня нараджэння **Вішнеўскага Уладзіміра Мікалаевіча** (17.02.1955, в. Балотчыцы), мастака, члена Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва.

**75** гадоў з дня нараджэння **Быкава Анатоля Мікалаевіча** (20.02.1950 в. Бранавічы), заслужанага трэнера БССР, майстра спорту СССР па цяжкай атлетыцы, рэкардсмена Беларусі па цяжкай атлетыцы ў рыўку (штанга).

**80** гадоў з дня нараджэння **Родчанкі Віктара Віктаравіча** (23.02.1945, в. Пакрашава), расійскага вучонага ў галіне ўстойлівасці і кіравальнасці самалётаў і мадэліравання палётаў, кандыдат тэхнічных навук.

## Сакавік

**75** гадоў з дня нараджэння **Булата Валерыя Аляксандравіча** (10.03.1950, в. Сярагі), кандыдата тэхнічных навук, дацэнта, намесніка дэкана Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

**120** гадоў з дня нараджэння **Каляды Анатоля Мацвеевіча (**13.03.1905, в. Шышчыцы), аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну.

**70** гадоў з дня нараджэння **Малярэнкі Аляксандра Дзмітрыевіча (**16.03.1955, г. Слуцк**),** вучонага ў галіне тэхналогіі прыборабудавання і іннавацыйнай дзейнасці, доктара тэхнічных навук, прафесара.

**85** гадоў з дня нараджэння **Шыдлоўскай Надзеі Антонаўны** (17.03.1940, в. Чалевічы), архітэктара.

**120** гадоў з дня нараджэння **Вечара Аляксандра Сцяпанавіча** (25.03.1905, в. Машчыцы - 4.5.1985), вучонага ў галіне біяхіміі, акадэміка НАН Беларусі, доктара біялагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Беларусі, паэта.

**110** гадоў з дня нараджэння **Мірончаыка Уладзіміра Юстынавіча** (27(па другіх звестках 29). 03.1915, в. Ячава – 30.06.1990), медыка-хірурга, заслужанага ўрача Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы.

## Красавік

**85** гадоў з дня нараджэння **Басалыгі Уладзіміра Самойлавіча** (1.04.1940, г. Слуцк – 7.06.2020), графіка, дыпламанта рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў мастацтва кнігі.

**120** гадоў з дня нараджэння **Баркоўскага Сцяпана Андрэевіча** (10.04.1905**,** г. Слуцк - 11.06.1966), этнографа, літаратурнага крытыка, літаратуразнаўца.

**145** гадоў з дня нараджэння **Дылы Язэпа** (Восіпа Лявонавіча) (14.04.1880, г. Слуцк – 7.04.1973), пісьменніка, тэатразнаўца, грамадскага дзеяча.

**95** гадоў з дня нараджэння **Платонава Расціслава Пятровіча** (15.04.1930, г. Слуцк – 21.03.2001), гісторыка, доктара гістарычных навук, прафесара, публіцыста.

**80** гадоў з дня нараджэння **Клімянкова Сцяпана Сцяпанавіча** (23.04.1945, в. Вялікая Сліва), вучонага ў галіне парашковай металургіі, доктара тэхнічных навук, прафесара.

# Май

**440** гадоў з дня нараджэння **Соф'і Слуцкай** (дзявочае Алелькавіч, па мужу Радзівіл (1.5.1585, г. Слуцк – 1.04.1612) рэлігійнай дзеячкі, асветніцы, беларускай праваслаўнай святой, апошняй з роду Алелькавічаў.

**70** гадоў з дня нараджэння **Савановіча Мікалая Іванавіча** (2.05.1955, в. Лучнікі – 31.12.2003 г.) кандыдата тэхнічных навук у галіне фізікі.

**405** гадоў з дня нараджэння **Радзівіла Багуслава** (3.05.1620 – 31.12.1669), ваеннага і дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, паэта, мастака, мецэната. Сабраў у Слуцку архіў, бібліятэку, дзе зберагаліся каштоўныя рукапісы, у тым ліку Радзівілаўскі летапіс.

**310** гадоў з дня нараджэння **Радзівіла Гераніма Фларыяна** (4.05.1715, Брэсцкі павет - 1760), дзяржаўнага дзеяча ВКЛ, мецэната, заснавальніка Слуцкага тэатра Радзівілаў.

**120** гадоў з дня нараджэння **Гаўрука Юркі** (Юрыя Паўлавіча) (6.05.1905, г. Слуцк – 18.2.1979 г.) паэта, крытыка, аўтара першай у Беларусі кнігі паэтычных перакладаў "Кветкі з чужых палёў".

**90** гадоў з дня нараджэння **Далжонка Арэста Васільевіча** (7.05.1935, Докшыцкі р-н. – 1.04.2016г.), дзеяча самадзейнага мастацтва, харавога дырыжора, заслужанага работніка культуры, кіраўніка Казловіцкага народнага хору.

**95** гадоў з дня нараджэння **Паўлавай Ніны Мікалаеўны** (10.05.1930, в. Паўстынь), майстра мастацкага ткацтва.

**70** гадоў з дня нараджэння **Корзуна Барыса Васільевіча** (13.05.1955, в. Лучнікі), вучонага ў галіне фізіка-матэматычных навук.

**60** гадоў з дня нараджэння **Бархатковай Алены Мікалаеўны** (24.05.1965, г. Слуцк), мастака-жывапісца.

**60** гадоў з дня нараджэння **Марозава Аляксандра Уладзіміравіча** (29.05.1965, г. Слуцк), фалькларыс-та, славіста, культуролага, доктара філалагічных навук.

## Ліпень

**120** гадоў з дня нараджэння **Кулікова Міхаіла Міхайлавіча** (25.07.1905 – 26.7.1944), удзельніка вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У баях за вызваленне Слуцка – камандзір механізаванай брыгады. За вызваленне Слуцка брыгадзе прысвоена ганаровае званне "Слуцкай". Пахаваны ў Слуцку.

**80** гадоў з дня нараджэння **Цвірко Міхаіла Паўлавіча** (25.07.1945, в. Грэск), вучонага-фізіка, доктара фізіка-матэматычных навук (1989), прафесара (1990)

**70** гадоў з дня нараджэння **Мурашкі Вячаслава Пятровіча** (31.07.1955, в. Бязверхавічы), мастака-афармляльніка, плакатыста, жывапісца.

## Жнівень

**105** гадоў з дня нараджэння **Бандырчыка Васіля Кірылавіча** (1.08.1920**,** в. Кірава – 2009), этнографа, члена-карэспандэнта Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара, заслужанага работніка культуры Беларусі, лаўрэата прэміі НАН Беларусі (1999).

**55** гадоў з дня нараджэння **Румо Алега Алегавіча** (4.08.1970, г. Слуцк), вучонага, галоўнага трансплантолага Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, доктара медыцынскіх навук, прафесара, заслужанага ўрача Рэспублікі Беларусь.

**185** гадоў з дня нараджэння **Абуховіча Альгерда Рышардавіча (псеўд. Граф Бандынэлі)** (6.08.1840, в. Калацічы Глускага раёна – 22.08.1898), паэта, мемуарыста, перакладчыка, аднаго з пачынальнікаў жанру байкі ў беларускай літаратуры. Вучыўся ў Слуцкай гімназіі, займаўся рэпетытарствам ў Слуцку.

**75** гадоў з дня нараджэння **Анцыповіча Мікалая Барысавіча** (6.08.1950, в. Бранавічы), палкоўніка, кандыдата ваенна-тэхнічных навук, загадчыка кафедры Беларускай ваеннай акадэміі.

**135** гадоў з дня нараджэння **Козела Васіля Паўлавіча** (12.08.1890, в .Кляпчаны - 7.11.1980),

старшыні калгаса “Камбайн” (1929-1932), потым калгаса “1 Мая”, Героя Сацыялістычнай Працы.

**115** гадоў з дня нараджэння **Пратасені Пятра Федаравіча** (25.08.(па іншых звестках 25.01)1910, былая в. Баслаўцы (цяпер – в. Барок) – 5.06.1987), філосафа, доктара філасофскіх навук, прафесара. Працаваў у галіне дыялектычнага матэрыялізму і філасофскіх праблем прыродазнаўства.

**75** гадоў з дня нараджэння **Каржанеўскай Галіны Анатольеўны** (27.08.1950, в. Лясішча), паэтэсы, драматурга, крытыка.

## Верасень

**70** гадоў з дня нараджэння **Аджаева Уладзіміра Барысавіча** (13.09.1955, г. Слуцк), вучонага-фізіка, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, выдатніка адукацыі Беларусі.

**40** гадоў з дня нараджэння **Пракапенка** (**Самусевіч) Анастасіі Валер’еўны** (20.09.1985, г. Слуцк**),** спартсменкі (сучаснае пяцібор’е), майстра спорту міжнароднага класа Беларусі, чэмпіёнка Еўропы, двухразовая чэмпіёнка свету, прызёр Алімпійскіх гульняў.

**100** гадоў з дня нараджэння **Траяноўскага Алеся** (Аляксандра Пятровіча) (22.09.1925, былы хутар Уздымач, Слуцкі раён – 18.03.2005), беларускага пісьменніка, перакладчыка, крытыка, публіцыста.

Перакладаў з верхнялужыцкай, ніжнялужыцкай, кашубскай, польскай і ўкраінскай моваў.

**95** гадоў з дня нараджэння **Дайліды Віктара Браніслававіча** (28.09.1930**,** в. Славінск – 21.8.2006), пісьменніка, выдатніка народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**75** гадоў з дня нараджэння **Барабанава Леаніда Генадзьевіча** (29.09.1950, г. Слуцк - 05.10.2012), вучонага ў галіне дэрматавенералогіі, доктара медыцынскіх навук, прафесара.

**100** гадоў з дня нараджэння **Лапца Паўла Дзянісавіча** (29.09.1925, в. Ніва Слуцкага раёна), вучонага-гісторыка.

## Кастрычнік

**80** гадоў з дня нараджэння **Абравец Святланы Мітрафанаўны** (2.10.1945, г. Слуцк – 08.06.2021) вучонага-геолага, лаўрэата прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В. А. Капцюга (2004)

**70** гадоў з дня нараджэння **Сматрына Сяргея Міхайлавіча** (8.10.1955 г., в. Барок), вучонага ў галіне хірургіі, доктара медыцынскіх навук

**75** гадоў з дня нараджэння **Старжынскага Валерыя Паўлавіча** (16.10.1950, в. Замошша), вучонага-філосафа.

# Лістапад

**110** гадоў з дня нараджэння **Міхася Кавыля** (Лешчанкі Язэпа Казіміравіча) (1.11.1915, в. Покрашава – 6.04 2017г.**),** паэта, крытыка, празаіка, дзеяча беларускага замежжа.

**85** гадоў з дня нараджэння **Розавай Тамары Фёдараўны** (2.11.1940, в. Сярагі), архітэктара, члена Беларускага саюза архітэктараў.

**85** гадоў з дня нараджэння **Гучка Яўгена Сяргеевіча** (4.11.1940, г. Слуцк – 01.01.2024), пісьменніка.

**85** гадоў з дня нараджэння **Скрыпнічэнкі Георгія Сяргеевіча** (12.11.1940, г. Нікалаеў, Украінская ССР – 12.08.2015 г.), беларускага мастака. Вучыўся ў СШ №10 г. Слуцка, займаўся ў студыі выяўленчага мастацтва Гарадскога дома піянераў і школьнікаў (кіраўнік У.С.Садзін).

**80** гадоў з дня нараджэння **Белавусава Алега Паўлавіча** (16.11.1945, г. Слуцк – 26.03.2009), мастацтвазнаўца, дзеяча кінамастацтва, сцэнарыста, рэжысера, заснавальніка і мастацкага кіраўніка майстэрні мультфільмаў кінастудыі “Беларусьфільм”, анімацыйных студый.

**90** гадоў з дня нараджэння **Гаўрылавец Клары Усеваладаўны** (18.11.1935, г. Слуцк), вучонага ў галіне педагогікі, акадэміка Беларускай акадэміі адукацыі.

**85** гадоў з дня нараджэння **Валатовіча Антона Сцяпанавіча** (11.1940, в. Лясішча – 16.06.1971 г.), мастака. Працаваў у станкавым і манументальным жывапісе.

## Снежань

**95** гадоў з дня нараджэння **Вашкевіча Аркадзя Пракопавіча** (12.12.1930, в. Цяраспаль – 2001 г.), механізатара, Героя Сацыялістычнай Працы.

**115** гадоў з дня нараджэння **Лямешчанкі Сяргея Дзмітрыевіча** (29.12.1910 – 1.11.1998 ), старшыні калгаса імя Кірава, Героя Сацыялістычнай Працы

**Памятныя даты календара, 2025. г. Слуцк, Слуцкі раён**

Складальнік: С. І. Сарагавец

Рэдактар: Л. В. Гурыновіч

Камп’ютэрны набор: С. І. Сарагавец

223610 г.Слуцк,
вул.Капыльская, 2а
Дзяржаўная ўстанова
“Слуцкая раённая
цэнтральная
бібліятэка”

e-mail: info@slucklib.by